# УЗБАГАЧЭННЕ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ЛЕКСІКАЙ СА ЗНАЧЭННЕМ КОЛЕРУ

*Барысавец С. У.*
*(Беларусь, Мінск)*

У адпаведнасці з патрабаваннямі будучыя першакласнікі павінны адрозніваць і называць асноўныя колеры. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі неабходна вучыць малодшых школьнікаў ужываць прыметнікі са значэннем колеру пры апісанні розных прадметаў.

Аналіз тэкстаў падручнікаў паказаў, што ў дапаможніках для 1 класа амаль не прадстаўлены прыметнікі са значэннем колеру, нягледзячы на тое, што ў іх вельмі многа каляровых ілюстрацый, з апорай на якія вучні складаюць сказы і невялікія апавяданні. Сярод прапанаванага дыдактычнага матэрыялу нам сустрэліся толькі 4 прыметнікі са значэннем колеру: зялёны і чырвоны пры апісанні сцяга Беларусі, залаты пры апісанні пчолкі ў вершы А.Касцецкага "Што такое Бацькаўшчына?" і белы ў найменні помніка Белая вежа.

У падручніках 2 класа прыметнікі са значэннем колеру прадстаўлены больш шырока, але ў асноўным толькі пры апісанні прадметаў наваколля: белы бусел, чырвоны грыб-мухамор, чорныя чарніцы, шэры кот і г.д., акрамя таго ў тэкстах можна сустрэць некаторыя дзеясловы і назоўнікі, якія ў сваім значэнні ўтрымліваюць сему 'колер': чарнеюць праталінкі, зелянее траўка, чырванеюць суніцы, чарнеюць чарніцы, у чырвані гарыць усход. Заданні, скіраваныя на ўжыванне малодшымі школьнікамі прыметнікаў са значэннем колеру, сустракаюцца не вельмі часта, напрыклад, аўтары падручніка прапануюць вучням апісаць любімыя кветкі, назваць колер іх пялёсткаў [1, ч.1, пр. 27] або расказаць пра вочы матулі [1, ч.1, пр. 34]. Пры выкананні гэтага задання настаўніку варта звярнуць увагу на тое, што шэрымі і зялёнымі могуць быць розныя прадметы, а карымі – толькі вочы. Акрамя таго, вучні 2 класа выпісваюць з верша назвы колераў у алфавітным парадку, разважаюць аб тым, якія колеры пераважаюць вясной, называць колер воблачка [1, ч. 2, пр. 154].

Працягам працы па ўзбагачэнні маўлення вучняў лексікай са значэннем колеру могуць стаць наступныя заданні: адгадаць загадку: Хмара дробны дожджык сее, // сонца ярка свеціць, // у сем колераў квітнее што? // – Скажыце, дзеці (У.Мацвеенка), назваць колеры вясёлкі, завучыць на памяць адну з мнемападказак (*Чакаю апетытных жабак з беларускіх сажалак. Француз; Чыж аддаў жуку загад: брат, схавай фотаапарат* ), *прыдумаць свой сказ-падказку.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прааналізаваўшы падручнікі для 3 класа, мы заўважылі, што колькасць прыметнікаў са значэннем колеру значна павялічваецца, сустракаюцца кампазіты (чорна-аранжавы чмель, чорная-чорная варона, зеленавата-шэрыя плаўнікі, залаціста-жоўтыя кроны) і прыметнікі з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі (жоўценькая пеначка, рыжанькі грыбок, беленькія пялёсткі*)*.

На старонках падручнікаў шырока прадстаўлены загадкі, у якіх менавіта знешнія прыкметы дазваляюць здагадацца, пра каго ці пра што ідзе размова, напрыклад: Улетку шэры, *узімку* белы, *доўгія вушы мае, хутка ў лес уцякае.* (Заяц); або Сінявокі, слаўны, чысты, // Галавасты, залацісты. // Апранае нас здавён. // Здагадайцеся, хто ён? (Лён).

Пры вывучэнні антонімаў вучні processing процiпастаўляюць прыметнікі белы і чорны. Непасрэдна пры вывучэнні тэмы “Прыметнік” вучні размяркоўваюць прыметнікі па лексіка-семантычных групах: якасць, смак, колер, форма і памер, матэрыял, з якога зроблены прадмет. Настаўнік можа прапанаваць вучням назваць прадметы, якія можна ахарактарызаваць з дапамогай тых ці іншых прыметнікаў, або можа ўскладніць задачу – адны вучні загадваюць прадметы і называюць толькі прыметнікі, якія іх характарызуюць, а другія вучні павінны здагадацца, пра што ідзе размова. Варта пры выкананні гэтага задання сачыць за тым, каб вучні выкарыстоўвалі прыметнікі розных лексіка-семантычных груп, у тым ліку і назвы колераў.

У падручніках ***для 3 класа ўсё часцей сустракаюцца матываваныя колеравыя прыметнікі:*** вогненная паласа, серабрыстая рыбка, залацісты шар, агністая птушка. Настаўнік павінен акцэнтаваць увагу на значэнні такіх прыметнікаў, прапанаваць вучням аднесці іх да тых ці іншых асноўных колераў, акрамя таго можна арганізаваць працу і з іншымі ***матываванымі назвамі, у тым і праз аналіз таго, як яны ўтварыліся: лімон – лімонны, валошкі – валошкавы*** і г. д. ***Карысным будзе і падбор сінонімаў-матываваных каляронімаў да прыметнікаў, якія называюць асноўныя колеры, напрыклад чырвоны, сіні, жоўты.*** У якасці слоў для даведак можна прапанаваць словы ***крывавы, румяны, барвовы, валошкавы, лазурны, нябесны, сонечны, залацісты, лімонны.***

Прыметнікі са значэннем колеру – гэта якасныя прыметнікі, а таму яны нярэдка сустракаюцца ў тэкстах у формах ступеней параўнання або ў формах суб'ектыўнай ацэнкі. Выходзячы з гэтага, можна прапанаваць вучням знайсці прыметнікі ў ланцужку слоў:
– зелень, зялёны, зялёненькі, зелянец, зеленаваты;
– чырвоны, пачырванець, чырванейшы, чырвань, чырванаваты;
– бялюткі, бель, пабяліць, беленькі, белы, бялізна, белаваты.

Паколькі на ўроках рускай мовы вучні 3 класа знаёмяцца з адназначнымі і мнагазначнымі словамі, а таксама з прамым і пераносным значэннем слова, то пры выкананні заданняў, якія прадугледжваюць спалучэнне прыметнікаў з рознымі назоўнікамі, будзе карысным арыентаваць навучэнцаў на тое, каб яны



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў такіх спалучэннях выкарыстоўвалі прыметнікі як у прамым значэнні, так і пераносным, напрыклад, не толькі чырвоная кветка, чырвоная сукенка, чырвоны перац, чырвоны аловак, але і чырвоны радок, чырвоны дзень календара, Чырвоная кніга, Чырвоная Армія.

Такім чынам, заданні, скіраваныя на ўзбагачэнне слоўніка лексікай са значэннем колеру, пашыраюць кругагляд вучняў, удасканальваюць уменне дакладна выкарыстоўваць словы ў адпаведнасці са значэннем і сітуацыяй, развіваюць мысленне і маўленне малодшых школьнікаў.

### Літаратура


1. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : падручнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання: У 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015.


ПОЗИТОРИЙ Б